жыхароў горада да культурнай спадчыны сваёй малой радзімы.І гэта прынесла б вялікі плён.

1. Кулагін, А.М. Каталіцкія храмы Беларусі / А.М. Кулагін ; фатограф А.Л. Дыбоўскі. – Мінск, 2008. – С. 272–278.

2. Орша-город монастырей [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http ://ogog2.goroo-orsha.by/index.php?option=. – Дата доступа : 12.02.2016.

3. Памяць. Орша і Аршанскі раён: гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск, 2000. – Кн. 2. – С. 460–467.

4. Туронак, Ю. Фарміраванне сеткі рыма-каталіцкіх парафій на Беларусі ў 1387–1781 гадах / Ю. Туронак [Электронны рэсурс]. // Наша Вера. – Рэжым доступа : http://media.catholic.by/nv/n1/. –Дата доступа : 13.02.2016.

**Грыбко А.У.,** студ. 319 к гр.
Навуковы кіраўнік – Ражкова Л.Л.

## ВОПЫТ ДАСЛЕДВАННЯ ФАЛЬКЛОРНАЙ ПЕСЕННАЙ ТРАДЫЦЫІ ВЁСКІ РЭДЗЬКАЎШЧЫНА ПАСТАЎСКАГА РАЁНА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

У сучасным свеце хуткімі тэмпамі расце працэс урбанізацыі. Вёскі з іх самабытнай песеннай культурай паступова знікаюць з аблічча роднага краю. Я даўно зацікавілася гісторыяй і фальклорам маёй малой радзімы – вёскі Рэдзькаўшчына, што ў Пастаўскім раёне. Старыя людзі адыходзяць, а

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маладыя не цікавяцца сваёй культурай, яны не зацікаўлены ў яе захаванні. Вельмі балюча глядзець на тое, што выдатныя ўзоры песень знікаюць разам са старэйшым пакаленнем. Таму, было вырашана сабраць песні ў вёсцы Рэдзькаўшчына і іх даследваць.

У 2014 г. я сабрала ўзоры песень, якія захаваліся да гэтага часу. Яны адносяцца да розных абрадаў і жанраў. Сярод іх большасць складаюць песні сямейна-абрадавага цыкла (асабліва вясельныя), а таксама песні каляндарна-абрадавага цыкла (абрад «Жаніцьба Цярэшкі», валачобніцкія песні), ёсць некалькі бяседных песен.

Спявачкі вёскі Рэдзькаўшчына родам з бліжэйшых мясцін, але пасля таго, як яны выйшлі замуж у гэту вёску, заўсёды заставаліся актыўнымі удзельніцамі яе жыцця. Дзякуючы гэтаму можна меркаваць, што сабраныя матэрыялы адносяцца не толькі да канкрэтнай мясцовасці, але і да яе наваколля. Пяркоўская Глафіра Пятроўна (1941 г.) з вёскі Губіна, Шкорнік Глафіра Віктараўна (1932 г.) з вёскі Луцк-Казлоўскі, Вештарат Ядзьвіга Уладзіміраўна (1936 г.) з вёскі Жуперкі, Цярлюк Часлава Цітаўна (1938 г.) з вёскі Анкуды, Ганчар Вера Фамічна (1938 г.) з вёскі Сарокі, Гінько Гэлена Васільеўна (1925 г.) з вёскі Рэдзькаўшчына.

Запісам фальклору на Пастаўшчыне і яго вывучэннем займаліся такія вучоныя, як: Г.І. Цітовіч, П.В. Шэйн (Анталогія БНП), А. Чэрны (Pieśni Białoruskie z powiatu Dziśnieńskigo gubernii Wileńskiej), З.Я. Мажэйка (Песні беларускага Паазер'я) і інш.

Сучаснымі фальклярыстамі і даследчыкамі была зроблена вялікая праца – выдадзена вялікая колькасць кніг з матэрыяламі па фальклору і народнай творчаці. Намаганнямі Т.Б. Варфаламеевай, А.М. Боганевай, Т.В. Валодзінай, М.А. Козенка і інш. была падрыхтавана серыя тамоў «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў». У другім томе гэтай серыі даецца поўнае сістэматычнае апісанне рэгіёна Віцебскае Падзвінне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аналізуючы працы фалькларыстаў і этнографаў можна зрабіць вывад, што найменш даследаваным з’яўляецца Пастаўскі раён, асабліва яго ўсходняя частка. Таму, актуальным застаецца даследванне і захаванне культурнай спадчыны менавіта гэтага рэгіёна.

Рэгіён Віцебскае Падзвінне займае басейн сярэдняга цячэння Заходняй Дзвіны: на паўднёвым усходзе па дняпроўска-дзвінскім водападзеле мяжуе з Прыдняпроўем, на поўдні і паўднёвым захадзе па лясной паласе на поўнач ад Барысава і Лагойска да возера Нарач – з Цэнтральнай Беларуссю і Гродзенскім Панямоннем. На паўночным захадзе, поўначы і паўночным усходзе па дзяржаўнай граніцы Віцебскае Падзвінне мяжуе адпаведна з Літвой, Латвіяй, Пскоўскай і Смаленскай абласцямі Расіі.

Пастаўскі раён знаходзіцца на паўночным захадзе Беларусі і займае заходні выступ Віцебскай вобласці. Тэрыторыя раёна займае часткова Полацкую нізіну па сярэднім цячэнні ракі Дзісны і Свянцянскія грады. Паводле характару паверхні, а таксама па ўмовах фарміравання, тэрыторыю раёна можна падзяліць на тры часткі: паўночную – Дзісненскую нізіну, якая з'яўляецца часткай вялікай Полацкай нізіны, паўднёвую – Свянцянскія грады, і паўднёва-заходнюю – Нарацка-Вілейскую нізіну. Мясцовыя гаворкі Пастаўскага раёну належаць да паўночна-ўсходняга дыялекту і да яе паўночнай групы [1, с. 188–190]. Фалькларысты адзначаюць, што каляндарная традыцыя Беларускага Падзвіння вылучаецца жанравай разнастайнасцю абрадавых і гульнёва-забаўляльных форм, адметнасцю і багаццем лакальных варыянтаў.

Народны каляндар Падзвіння прадстаўлены багатай сістэмай свят, прысвяткаў, абрадаў, абрадавых дзеянняў, святочных звычаяў. Сюды ўваходзіць калядны комплекс з характэрнымі для Паазер’я асаблівасцямі (калядная гульня «Жаніцьба Цярэшкі», абыход двароў на «Тры Крулі» ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каталікаў); веснавы цыкл, дзе найбольш вызначаюць велікодны абрад абыхода двароў з валачобнымі песнямі; летні цыкл з купальскім абрадам і традыцыяй спявання летніх працоўных песен. Паазер'е ў сваёй заходняй зоне, – рэгіён скрыжавання розных веравызнанняў, культурных узаемаўплываў. Пераважная колькасць насельніцтва тут належыць да дзвюх асноўных хрысціянскіх канфесій: праваслаўя і каталіцызма [3, с. 25].

Вопыт нашага даследвання паказвае шэраг сучасных адметнасцяў, якія яскрава бачны на прыкладзе традыцыйных абрадаў і свят, так на Заходнім Паазер'і «польскія» калядоўшчыкі заходзілі не толькі да «сваіх» – каталікаў, але і да праваслаўных, і да стараабрадцаў, у якіх свята Нараджэння Хрыстова будзе святкавацца только праз два тыдні, а ў гэты час ідзе Піліпаўскі пост. Тым не менш іх прымалі, давалі падарункі – аказвалі павагу «людзям са свету». Гэты момант яскрава характарызуе сапраўднае добрасуседства людзей розных нацый і веравызнанняў на Беларусі [3, с. 27].

«Жаніцьба Цярэшкі» – адзін з самых яркіх «маркераў» тэрыторыі Паазер'я. Хоць арэал «Цярэшкі» ахоплівае таксама частку Цэнтральнай Беларусі (паўднёвая мяжа гульні праходзіць па Мядзельшчыне, Вілейшчыне, Лагойшчыне і Барысаўшчыне), але гэта ўжо перыфірыя арэала, граніцы «рассейвання» абрадавага дзейства. На Падзвінні «Цярэшку жэняць» паўсюдна на захад ад Полацка: у заходняй частцы Полацкага, Расонскім, Лепельскім, Глыбоцкім, Пастаўскім, Міёрскім, Верхнядзвінскім, усходняй частцы Браслаўскага раёнах.

На працягу святак ладзяцца вячоркі. Заканчваюцца святкі ў каталікаў не чынам вялікага асвячэння вады на Хрышчэнне Гасподне, як у правалаўных, а святам «Тры крулі», прысвечаным успаміну аб трох валхвах, якія прыйшлі з розных бакоў свету, каб пакланіцца нованароджанаму Хрысту. Гэта свята «Трох каралей» практычна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выцесніла ў заходнім календары свята Богаяўлення (Хрышчэння Гасподня). У гэты апошні дзень святак «адпісваецца» каляда – на сценах усіх хатніх і гаспадарчых пабудоў ставяцца крыжыкі. На «Тры крулі» таксама здзяйсняецца віншавальны абход двароў, якога няма ў праваслаўных [3, с. 27].

Таксама вызначальнай асаблівасцю каляд з'яўляюцца калядныя карагоды, якія ладзіліся моладдзю на вячорках. Адным з такіх з'яўляецца карагод «Явар». Так яго называюць людзі ў Рэдзькаўшчыне, але этнографы і фалькларысты ведаюць яго пад назвай «Проса». Цікавым з'яўляецца той факт, што абраду каляднага абыходу двароў у Рэдзькаўшчыне да вайны не існавала. Абрад абыходу двароў быў только на Вяліканне (па ўспамінах Гэлены Гінько, 1924 г.н). Толькі з цягам часу людзі сталі хадзіць адзін да аднаго з віншаваннямі і доўжыўся гэты перыяд да свята «Трох Крулей». Спявалі звычайна калядныя песні малітоўнага, касцёльнага зместу. Варта адзначыць, што ў вёсцы Рэдзькаўшчына пераважная большасць веруючых каталікаў, таму большасць калядарна-абрадавых традыцыйных песен не захавалася, або захавалася ў такой форме, што традыцыйны тэкст спяваецца на нетрадыцыйны напеў. Напрыклад, традыцыйны тэкст валачобных песен спяваецца на напеў вядомага касцёльнага гімну «Вясёлы дзень для нас настаў», званы ў народзе «Вэсолы».

На Вяліканне дзяўчатам, якія былі незамужнія абавязкова спявалі велічальную песню «Чырвоны ружы сад зялёны вішнёвы». Пасля спеву дзяўчына павінна была даць валачобнікам дзесятак яек. Велічальныя песні ў Рэдзькаўшчыне, у адрозненні ад іншых рэгіёнаў, спяваліся толькі на Вяліканне. Купальскія песні ў вёсцы Рэдзькаўшчына, нажаль, не захаваліся. Але старыя людзі ўспамінаюць абрады, якія выконваліся на купалле – распальванне купальскага вогнішча, купальскія варожбы, качанне ў расе, кіданне вянкоў у ваду, шуканне папараць-кветкі. Жніўныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

песні прадстаўлены журботнымі напевамі аб цяжкай жаночай долі. Іх можна яшчэ класіфікаваць як працоўныя.

Такім чынам можна сказаць, што ўся каляндарна-абрадавая традыцыя вёскі Рэдзькаўшчына скацэнтравана вакол двух галоўных хрысціянкіх свят – Каляд і Вялікання. У меньшай ступені распаўсюджаны летні каляндарна-абрадавы цыкл. Яго прадстаўляюць купальскія абрады і варожбы, а таксама жніўныя працоўныя песні. Сямейна-абрадавы цыкл прадстаўлены галоўнымі кропкамі ў жыцці чалавека – радзінамі, вяселлем і пахаваннем. На радзінах ў вёсцы Рэдзькаўчына заўсёды спявалі прыпеўкі куму і куме, некаторыя з іх былі абавязкова эратычнага зместу:

*«А кумок мой дарагі,*
*Не гладзі на пірагі,*
*Глядзі прама на мяне,*
*Заўлікаць буду цябе».*

Цэнтаральнае месца ў сямейна-абрадавым цыкле належыць вясельным песням. Па характару гучання іх можна падзяліць на тры вобразна-эмацыянальныя сферы: святочна-прыўзнятую («вясёлую»), лірычна – журботную («абідлівую») і драматычную. У вясёлай частцы вяселля спявалі песні для сватоў, якія едуць за маладой, таксама пелі, як ад’язджаюць з дому маладой да маладога. У лірычна-журботнай спявалі песні-просьбы, каб малады не абражаў сваю жонку і ставіўся да яе з павагай, а таксама спявалі  для маладой як яна ад’язджаіць са свайго дому. Цэнтральнай кропкай вяселля была яго драматычная частка – спеў для маладой «каб яна плакала» і плакаць на вяселлі маладая павінна была абавязкова. Гэты спеў адрозніваецца ад усіх іншых перш-найперш моваю. Яна складзена па-польску. Чаму спявалі менавіта яе, і як яна з’явілася на нашых землях няма адказу. Можна выявіць некалькі варыянтаў – распаўсюджанне польскай мовы і культуры з прыняццем каталіцызму (а

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

католікаў у Рэдзькаўшчыне пераважная большасць) і былым знаходжаннем усяго Пастаўскага раёна ў саставе Заходняй Беларусі, дзе праводзілася палітыка паланізацыі. Магчыма з гэтых часоў і прыйшоў у вёску гэты журботны вясельны спеў:

*«У зялёным гаіку скворONOчэк нудзі,*

*Паментай дзевчына, паненцтва не вруці» (...)*

*«Пшэжэгнай мне, мама, правай рэнчкай на кшыж,*

*Бо юж остатній раз на муй венок патшыж.*

*Мамуся жэгнала, тшы разы жэгнала.*

*Цурусь, мая, цурусь, чэго дачэкала?».*

Пасля вянчання ладзіліся гульні і танцы на якіх абавязкова іграў мясцовы ансамбль музыкантаў. Інструментарый ансамля складалі такія інструменты як скрыпка, цымбалы, дудка і гармонік. Варта адзначыць тое, што вясельныя напевы розных сфер амаль аднолькавыя, яны могуць адрозніваца толькі эмацыйным акрасам, варыянтамі распеву мелодый і зместам паэтычнага тэксту.

Такім чынам, размаўляючы са старэйшымі людзьмі, паводле ўласнай фальклорнай экспедыцыі, я пазнаёмілася з культурай роднага краю. Праца такога роду дапамагае мне ў большай ступені зведаць традыцыйную песенную культуру маёй вёскі ва ўсёй яе паўнаце, у быце, а не толькі ў сцэнічным яе ўвасабленні. Працуючы такім чынам з песенным матэрыялам, найбольш пазнаецца яго глыбінная сутнасць, сэнс і сімволіка песні. Гэта праца паказвае, што фальклор трэба збіраць і захоўваць нават і цяпер, бо жыццё людзей мяняецца, і тое, што было ў XIX ст. захавалася часткова, з’явіліся новыя ўзоры песень. Песні і звычаі рэгіёнаў паступова забываюцца, выцясняюцца радыё і тэлебачаннем. Моладзь мала цікавіцца культурай сваіх вёсак. Песенная культура, якая дагэтуль захавалася ў маленькай вёсцы служыць прыкладам культурнага жыцця яе жыхароў і іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асаблівым светапоглядам. І таму галоўная задача сучаснаці – зберагчы яе і перадаць наступным пакаленням.

1. Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак / пад рэд. А.І. Аванесава, К.К. Атраховіча (К. Крапівы), Ю.Р. Мацкевіч – Мінск, 1968. – 576 с.

2. Мажэйка, З. Песні Беларускага Паазер'я/ З. Мажэйка. – Мінск, 1987. – 763 с.

3. Традыцыйная культура беларусаў. У 6 т. Т. 2. Віцебскае Падзвінне / склад. Т.Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларуская навука, 2004. – 910 с.

4. Цітовіч, Г. Анталогія беларускай народнай песні / Г. Цітовіч. – Мінск , 1984. – 723 с.

5. Ćerny A. Pieśni Białoruskie z powiatu Dziśnieńskigo gubernii Wileńskiej. Zbjór Wiadomósci do antropologii krajowej. T.18 / A. Ćerny. – Kraków, 1895. – 41 c.

**Грыцэвіч Ю.І.,** студ. 114 гр.
Навуковы кіраўнік – Гулак А.А.

## ЖАРТОЎНЫЯ ВЫСЛОЎІ І ЗЫЧЭННІ Ў КАНТЭКСЦЕ ВЯСЕЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ

З празаічных гумарыстычных жанраў малой формы найбольшую папулярнасць у народзе маюць анекдоты, жарты, гумарэскі, або досціпы. Мы спынімся на жартоўных зычэннях, якія выконваліся і цяпер часткова бытуюць на вяселлі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ